*Литература*

1. Играев, Б.А. Современная периодическая печать в системе экономических коммуникаций: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.01.10 / Б.А. Играев. – М.: ФГБОУ «Академия медиаиндустрии», 2013. – 30 с.
2. Сайт ОАО «Магнитогорский металлургический комбинат», раздел «Пресс-центр», страница «Корпоративные медиа» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.mmk.ru/press_center/corporate_media. – Дата доступа: 28.12.2016.
3. Сайт ОАО «Белорусский металлургический завод», раздел Пресс-центр / [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belsteel.com/press/novosti.php. – Дата доступа: 28.12.2016.
4. Сайт гос. учреждения «Вестник Белнефтехима» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belchemoi.by. – Дата доступа: 28.12.2016.

***Марына Прахарэня***

## НАСЦЕННЫ ДРУК У БССР У 20-я гг. ХХ ст.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны перад савецкай уладай паўстала складаная задача – кансалідаваць грамадства і сфарміраваць у насельніцтва разуменне палітычнага курсу маладой краіны. Выключная роля ў рэалізацыі пастаўленых задач належала не толькі друкаваным перыядычным выданням, але і насценным газетам.

Як тып выдання насценныя газеты сталі актыўна распаўсюджвацца пасля Грамадзянскай вайны. Ва ўмовах эканамічнай разрухі 1920-х гг. дзякуючы малой затратнасці, зручнасці, прастаце выпуску, даступнасці, аператыўнасці насценны друк становіцца масавым відам савецкай прэсы. Такія выданні выходзілі на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, навучальных установах і інш. Яны асвятлялі жыццё рабочага калектыву, апісвалі вытворчы працэс, выступалі выразнікамі грамадскай думкі, развівалі сацыяльную актыўнасць працоўных.

Неабходнасць разгортвання насценнага друку падкрэслена ў пастанове Аргбюро ЦК РКП(б) ад 1 снежня 1924 г. «Аб насценных газетах». У дакуменце адзначалася выключная роля гэтага тыпу выдання ў павышэнні эфектыўнасці вытворчага працэсу. Тамсама вызначаўся тэматычны накірунак насценгазет: арганізацыя і дзейнасць пэўнага прадпрыемства, выкананне вытворчага задання, вынікі работы за пэўны прамежак часу, тэхнічныя дасягненні [3].

На фабрыках і заводах БССР першыя насценгазеты з’явіліся яшчэ ў верасні 1923 г. [2, л. 17]. Паступова іх колькасць павялічвалася. Так, калі ў пачатку 1924 г. у нашай краіне налічвалася 21 насценгазета, то ў канцы гэтага ж года – 161 [1]. Улада надавала значную ўвагу наяўнасці такога віду выданняў

на прадпрыемствах. Мясцовыя органы штомесячна вялі ўлік і прадстаўлялі інфармацыю аб колькасці насценных газет у аддзел друку ЦБ КП(б)Б.

Выпуск сценгазеты ажыццяўляла рэдакцыйная калегія, якая выбіралася на агульным сходзе. Кожны член рэдкалегіі загадваў пэўным аддзелам. Рэдактарам часцей за усё з'яўляўся рабкар, які супрацоўнічаў з перыядычнымі выданнямі. Нярэдка ў падрыхтоўцы газеты ўдзельнічалі прадстаўнікі мясцовых ячэек КП(б)Б і члены ЛКСМБ. У практыку ўваходзілі пашыраныя пасяджэнні рэдкалегіі з удзелам рабкараў, цэхаргаў, прадстаўнікоў найбольш важных арганізацый прадпрыемства – культкама, членаў камісіі па ахове працы, рабоце сярод жанчын і інш. Такія нарады давалі магчымасць рэдкалегіі лепш арыентавацца ў розных галінах дзейнасці прадпрыемства.

Перыядычнасць выхаду большасці насценных газет – раз у два тыдні. Так, у канцы 1924 г. з 43 сценгазет Мінскай акругі 21 выходзіла раз у два тыдні, 1 – раз у тры тыдні, 16 – раз у месяц, 5 – па меры паступлення матэрыялаў. 36 выданняў выходзіла на рускай мове, 6 – на беларускай і рускай, 1 – на яўрэйскай. Сярэдняя колькасць матэрыялаў у адным нумары – 25–30. Асноўны жанр – нататка [2, л. 17].

Вельмі часта назвы газет адлюстроўвалі прафесію ці характар вытворчасці на прадпрыемстве. Так, насценгазета Гомельскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» называлася «Швейник», цвікарнага завода «Чырвоны Кастрычнік» у Оршы – «Гвоздь» і інш. Калектывы прадпрыемстваў машынабудавання, дрэваапрацоўчай індустрыі выпускалі выданні пад назвамі «Сверло», «Двигатель» і г. д.

Дзейнасць сценгазет рэгламентаваў аддзел друку пры агітацыйна-прапагандысцкім аддзеле Цэнтральнага бюро КП(б)Б. Супрацоўнікі ўстановы рэгулярна дасылалі інструктажы для рэдкалегій выданняў. Так, з боку кіраўніцтва вельмі часта звярталася ўвага на непрыкметны знешні выгляд газеты. Сярод рэкамендацый па яго ўдасканаленні прапаноўвалася наступнае: павялічыць колькасць малюнкаў і карыкатур, зрабіць шрыфт больш разнастайным, пісаць загалоўкі яскравымі фарбамі, упарадкаваць вёрстку, аддзяляючы калонкі тлустымі палоскамі. Дазвалялася пісаць газету ад рукі ці друкаваць на машынцы. Рэгламентаваўся нават памер выдання. Так, па вышыні газета не павінна была перавышаць аршын (71 см), а па шырыні – абавязкова быць большай за вышыню.

Асаблівая ўвага надавалася зместу сценгазеты. Напрыклад, матэрыялы трэба было змяшчаць у наступных рубрыках: побыт, камсамольскае і партыйнае жыццё, жаночы аддзел. Неаднаразова падкрэслівалася, што мова выдання павінна быць простай, яснай, дакладнай, пазбаўленай замежных

слоў і доўгіх выразаў. Калі на прадпрыемстве працавала вялікая колькасць людзей іншых нацыянальнасцей, то рэкамендавалася рыхтаваць экзэмпляр газеты на іх роднай мове ці пісаць матэрыялы на змешанай мове. У адным з інструктажаў аддзел друку ўказваў на недапушчальнасць вершаманіі – імкнення друкаваць празмерна вялікія вершы на старонках сценгазет. У якасці негатыўнага прыкладу была прыведзена насценная газета «Будильник», палову якой займаў верш.

Насценгазета карысталася аўтарытэтам сярод работнікаў прадпрыемства. Аб гэтым сведчыць значная колькасць сценкараў, якія рэгулярна прадстаўлялі свае матэрыялы. Так, з газетай «Рабочий быт» супрацоўнічала 50 чалавек, «Красный финансист» – 25, «Красный транспортник» – 20, «Красный грузчик» – 16 [2, л. 46–48]. Амаль усе сценкары пісалі пад псеўданімамі, бо вельмі часта іх матэрыялы насілі крытычны і выкрывальны характар, паказвалі недахопы ў рабоце прадпрыемства, асуджалі негатыўныя праявы грамадскага жыцця (ляноту, п’янства, крадзеж і інш.). Гэта адпавядала асноўнай мэце насценгазет – «змагацца з непарадкамі і злоўжываннямі на прадпрыемствах» [3, с. 5]. На нарадзе адказных рэдактараў насценных газет пры Ляхавіцкім раённым камітэце КП(б)Б так і адзначалася: «Чым больш недахопаў будзе адзначана газетай, тым яна будзе лепшай» [2, л. 49].

Адначасова з адлюстраваннем недахопаў выданню трэба было ўказваць на прычыны, прапаноўваць шляхі іх вырашэння. Кіраўніцтва ў абавязковым парадку рэагавала на такія публікацыі, у наступным нумары адказвала на ўзніклыя пытанні. Аўтарскі калектыў сценгазеты, у сваю чаргу, пільна сачыў за гэтым працэсам. Рэдкалегія перыядычна рабіла справаздачу на агульным сходзе рабочых, дзе паведамляла аб выніках вырашэння той ці іншай праблемы, прадстаўленай у выданні.

Акрамя таго, насценныя газеты з’яўляліся своеасаблівай школай для будучых рабкараў, якія, атрымаўшы тут неабходны вопыт, пачыналі супрацоўніцтва з акруговымі і рэспубліканскімі выданнямі. Каб палепшыць якасць матэрыялаў і пазнаёміць сценкараў з асновамі журналістыкі, у рэдакцыі насценных газет прыходзілі кваліфікаваныя супрацоўнікі рэгіянальных і рэспубліканскіх выданняў, арганізоўвалі завочныя курсы журналісцкай практыкі. У пачатку 1930-х гг. на старонках раённых газет з’яўляліся спецыяльныя рубрыкі, прысвечаныя агляду матэрыялаў сценгазет, дзе рабіўся пабрабязны аналіз дапушчаных памылак. Галоўная задача такіх захадаў – крытыкуючы, дапамагаць [1].

Такім чынам, насценныя газеты не толькі выконвалі інфармацыйную, адукацыйную, выхаваўчую функцыі, але і садзейнічалі адаптацыі людзей у новых умовах. Яны выступалі выразнікам грамадскай думкі і формай праяўлення

сацыяльнай актыўнасці насельніцтва. У падрыхтоўцы матэрыялаў для сценгазеты ўдзельнічала значная колькасць людзей, што дазваляла развіваць іх ініцыятыўнасць, адказнасць, самастойнасць, уменне супрацоўнічаць, аналізаваць, бачыць недахопы, вырашаць праблемы, весці дыялог. Не заўсёды сценгазеты былі якаснымі, але сам факт іх функцыянавання сведчыў аб значнасці такога тыпу выдання для арганізацыі паспяховай работы прадпрыемства ці ўстановы. Менавіта насценны друк стаў той асновай, на якой у 1930-я гг. з'явілася вялікая колькасць шматтыражных выданняў.

*Літаратура*

1. Жалин, А. Стенгазета в профячейках / А. Жалин // Звезда. – 1924. – 17 снежня. – С. 3.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 1807.
3. О партийной и советской печати. – М.: Правда, 1954. – 692 с.

***Людмила Саенкова-Мельницкая***

## ТРАНСФОРМАЦИЯ ТИПОЛОГИЧЕСКИХ ПАРАМЕТРОВ БЕЛОРУССКОГО КИНОИЗДАНИЯ: ОТ ВЕДОМСТВЕННОГО БЮЛЛЕТЕНЯ К СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОМУ ЖУРНАЛУ

Расширение сегмента корпоративных, ведомственных, специализированных изданий подтверждает мысль Мануэля Кастельса о повышении уровня «подвижности» информационной системы, об увеличении «кастомизированных и диверсификационных» каналов массовой информации, об усилении тенденции к «фрагментации общества», о появлении новых возможностей для «социальной стратификации» [3, с. 141, 147]. В этом сегменте свою определенную нишу занимают издания, функциональной особенностью которых является культурно-просветительская, гуманитарно-образовательная, художественно-эстетическая, ценностно-регулирующая деятельность в представлении разных видов художественной культуры. Специализированные издания, несмотря на определенную тематическую «ангажированность» и «специальную» аудиторию, стали массово востребованными в период «нашествия» новых информационных и коммуникационных технологий [2]. Специализированная пресса всегда была типологическим феноменом отечественной журналистики. Некоторые исследователи (Е.П. Прохоров, М.В. Шкондин, А.А. Грабельников, П.И. Чуков), говоря о движущих факторах формирования системы журналистики, подчеркивали, что для создания максимально полной, объемной, всесторонней и завершенной картины окружающей действительности, в системе возникает множество изданий, способных удовлетворять запросы